Источник: **«Звязда» - 2013-10-08**

## «Апантаны пошукам каранёў беларускай дзяржаўнасці»

**Менавіта так характарызуюць выкладчыка, дасведчанага гісторыка Мікалая Сташкевіча. Гэтыя і шматлікія іншыя добрыя словы ў гонар навукоўца, што пайшоў з жыцця два гады таму, гучалі падчас пасяджэння «круглага стала», прысвечанага 75-годдзю з дня нараджэння Мікалая Сташкевіча.**

Многія навукоўцы-гісторыкі, якія прыйшлі ў гэты дзень падзяліцца сваімі ўспамінамі пра гэтага чалавека, казалі, што ім надзвычай яго не хапае, што такую страту немагчыма нечым запоўніць. Мікалай Сташкевіч валодаў выключнымі энцыклапедычнымі ведамі, быў надзвычай дасведчаным у любым гістарычным пытанні. Калі ж нейкай тэмай дасканала не валодаў, то пачынаў аналізаваць, шукаць лагічныя довады і заўсёды прыходзіў да цікавых, трапных высноў — гэтаму ж вучыў і сваіх паплечнікаў. І літаральна ўсе, хто прысутнічаў на канферэнцыі, называлі яго сваім сябрам. Пасля сябе Сташкевіч пакінуў выдатных вучняў: падрыхтаваў 5 дактароў і 9 кандыдатаў навук. Сярод апошніх і Вадзім Гігін, з цеплынёй узгадвае выкладчыка:



— Я ставіўся да яго як да бацькі. А калі сыходзіць бацька, гэта заўсёды цяжка. Гэта быў вельмі неардынарны чалавек. Усе яго ўчынкі і дзеянні былі творчымі. Для мяне ён настаўнік, чалавек, які даў мне дарогу ў жыццё… На мой погляд, яго вялікая заслуга ў тым, што ў няпросты час перабудовы ён не адмовіўся ад сваіх прынцыпаў. Гэта не значыць, што ён не пераглядаў пэўныя погляды, але ён не адмаўляўся менавіта ад сваіх прынцыпаў. Яго паважалі прадстаўнікі ўсіх палітычных лагераў, бо разумелі значнасць гэтай фігуры.

Мікалай Сташкевіч спрычыніўся літаральна да ўсіх падручнікаў, энцыклапедый, методык выкладання гістарычнай навукі. 5 гадоў ён узначальваў Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, таксама выкладаў у Беларускім дзяржаўным універсітэце, Беларускім эканамічным універсітэце.

Вадзім Гігін прыгадаў, што літаральна за два гады гістарычная навука і ў цэлым сацыяльна-гуманітарны цыкл страцілі знакавыя імёны. Акрамя Мікалая Сташкевіча гэта Павел Лойка, Віталь Скалабан, Міхась Чарняўскі і іншыя. «Стрыжні, якія існавалі, іх няма, — гаворыць Вадзім Гігін. — Узнікла пустэча. Бо гэтыя людзі былі надзвычай харызматычныя». Да 75-годдзя з дня нараджэння Сташкевіча быў прымеркаваны і выпуск «Гісторыка-археалагічнага зборніка» Інстытута гісторыі НАН Беларусі. Ён змяшчае раздзел «Памяці М.С. Сташкевіча». У кнізе надрукаваны таксама артыкулы гісторыкаў і археолагаў Беларусі, прысвечаныя актуальным праблемам айчыннай гісторыі і метадалогіі гістарычных даследаванняў (раздзелы «Метадалогія гісторыі», «Археалогія»). Акрамя таго, апублікаваны матэрыялы, якія змяшчаюць вынікі навуковых даследаванняў супрацоўнікаў Інстытута гісторыі за 2011-2012 гады (раздзелы «Гісторыя», «Хроніка»).

Летась напрацоўкі навукоўца былі сабраны ў кнігу «Праблемы фарміравання беларускай дзяржаўнасці ў XX — пачатку XXI стагоддзя: выбраныя працы М.С. Сташкевіча». Удзельнікі «круглага стала» расчулена казалі, што Мікалай Сташкевіч пайшоў з жыцця заўчасна, што нешта ўнутры яго надламілася і перашкаджала прыняць бескарысную дапамогу і прафесійныя прапановы сяброў-калег. І ўсім здавалася, што зараз Сташкевіч зойдзе, сядзе побач і скажа сваё мудрае слова, якое прыйдзецца даспадобы ўсім…

**Ніна ШЧАРБАЧЭВІЧ**